*Арт-лекторый*

Наталля СЯЛІЦКАЯ,
вядучы навуковы супрацоўнік
Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

# "ГЭТА НЕ ВЯЛІКАЯ, А НАЙВЯЛІКШАЯ ПЕРАМОГА!"

## ВАЙНА Ў ТВОРЧАСЦІ МАЯ ДАНЦЫГА

Творчасць Мая Вольфавіча Данцыга (27 красавіка 1930 г. – 26 сакавіка 2017 г.), народнага мастака Беларусі, прафесара Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, уладальніка ордэна Францыска Скарыны і ордэна Пашаны, – яркая з'ява ў гісторыі нацыянальнай культуры XX ст. У беларускім выяўленчым мастацтве ён упэўнена заявіў пра сябе яшчэ на пачатку 1960-х. У арт-прастору прыйшоў сапраўдны майстар – малады, дзёрзкі, незалежны, з багатым творчым патэнцыялам і смелымі ідэямі, якія мог увасобіць на самым высокім прафесійным узроўні. Наватар, шасцідзясятнік, аптыміст, ён стварыў сваю мастацкую мову. Яго творы вылучаюцца вялікімі памерамі, размашыстым пісьмом, смелым спалучэннем колераў. На пытанне пра параметры яго карцін ён адказваў коратка: "Крылы ёсць. Мастак павінен мець арліныя крылы!"

Май Данцыг напісаў больш як пяцьсот палотнаў, што ўвайшлі ў залаты фонд беларускага мастацтва. Сёння яго творы захоўваюцца ў музеях Беларусі, а "Аўтапартрэт" (1976) займае годнае месца ў калекцыі жывапісу XX ст. Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі ў Маскве.

Яшчэ ў самым пачатку творчага шляху Май Данцыг вызначыў некалькі галоўных тэм, якія распрацоўваў і інтэрпрэтаваў на працягу жыцця: горад, навабудоўлі, працоўныя будні, партрэты дзеячаў культуры.

Магістральнай жа тэмай у творчасці мастака стала вайна. Самым галоўным днём у годзе ён шчыра лічыў 9 мая. "Гэта не вялікая, а найвялікшая Перамога!" – любіў паўтараць майстар. Вайна прымусіла адзінаццацігадовага хлопчыка рана пасталець. І дзіцячая памяць назаўжды захавала яе жахі і драмы: першыя дні вайны; эвакуацыя з сям'ёй з роднага Мінска ў далёкі Ульянаўск, дзе прабыў чатыры цяжкія, галодныя гады…

У 1944 г. сям'я вярнулася дадому. Пасля Мінскага мастацкага вучылішча, дзе яго педагогам быў выдатны жывапісец Віталь Цвірка, Май Данцыг з адзнакай скончыў адну з самых прэстыжных мастацкіх ВНУ СССР таго часу – знакаміты Маскоўскі мастацкі інстытут імя В. І. Сурыкава. А пасля больш як паўстагоддзя выкладаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер – Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў), выхаваўшы некалькі пакаленняў беларускіх творцаў, сярод якіх А. Адамчык, А. Бараноўскі, І. Бархаткоў, А. Вырва, Л. Дударэнка, А. Задорын, Р. Заслонаў, С. Ігнаценка, У. Кожух, Г. Конанава, Ю. Крупянкоў, А. Кузняцоў, А. Мацievіч, П. Назаранка, Л. Асядоўскі, І. Свянціцкі, В. Сумараў і многія іншыя. Май Вольфавіч у час выкладчыцкай дзейнасці імкнуўся даць вучням перш за ўсё прафесійныя веды, той падмурак, на якім ствараецца асоба мастака. "Бо толькі пры наяўнасці высокага сярэдняга ўзроўню школы маглі нарадзіцца такія стаўпы, як Мікеланджэла, Эль Грэка, Рэмбрант, Ван Дэйк, Хальс", – справядліва заўважаў педагог…

Што ж вылучае творы Мая Данцыга сярод шматлікіх карцін яго сучаснікаў? Чаму многія палотны працягваюць жыць самастойным жыццём, застаючыся актуальнымі і ў XXI стагоддзі?

Адказваючы на гэтыя пытанні, па-першае, варта памятаць пра час, у які вучыўся і фарміраваўся Май Данцыг, а таксама пра тыя настроі, што панавалі ў канцы 1950 – пачатку 1960-х гг. у творчым асяроддзі маладых. Агаленне жывапісных прыёмаў, наўмысная плоскасная агрубленая трактоўка вобразаў – усё гэта надавала іх працам жаданую праўдзівасць і пераканаўчасць. Шасцідзясятнікі актыўна выкарыстоўвалі і сумяшчалі традыцыі мастацкага аб'яднання "Бубновы валет", Таварыства мастакоў-станкавістаў (ОСТа – Общества станковистов), сімвалізму. Прычым яны імкнуліся абнавіць гэтую форму, у пэўнай меры вызваліўшы ад напластаванняў старой ідэалогіі і стылявога штампа. "Мой рэалізм – не рэалізм перасоўнікаў, – сцвярджаў Данцыг. – Я вучыўся ў фавістаў, экспрэсіяністаў… Рэалізм павінен быць сапраўдным, сутнасным, а не проста пісаннем з натуры ці без яе, галоўнае – каб гэта было моцна, магутна, пераканаўча і эмацыйна". І такое творчае крэда лейтматывам праходзіць праз усю яго дзейнасць.

І, па-другое, вельмі важна разумець творчую ўстаноўку мастака: "Заўсёды хацелася зрабіць нешта насуперак, не тое, што робяць усе. Бо самае цікавае ў мастацтве нават не новая тэма, а старая, узятая і вырашаная па-новаму". І менавіта гэтае імкненне "насуперак" нараджала грандыёзныя па задуме і наватарскія па форме творы.

Нягледзячы на тое, што вайна наўпрост закранула яго жыццё, майстар не спяшаўся "вы-

# “ПАМЯЦЬ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ...”

## ДА 80-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ



*Май Данцыг.*
**Беларусь – маці партызанская.**
1967 г. Палатно, алей.
*Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь.*

# "ПАМЯЦЬ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ…"

## ДА 80-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ



***Май Данцыг.***

**Партызанскае вяселле.**

1968 г. Палатно, алей.

*Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь.*

казвацца" на гэтую тэму. Такому глыбокаму, эпічнаму мастаку, як Май Данцыг, спатрэбіўся час, каб успаміны ваенных гадоў змаглі выкрышталізавацца ў яркія, лаканічныя вобразы, здольныя расказаць усяму свету пра трагедыю і мужнасць савецкага народа. У творах, прысвечаных Другой сусветнай вайне, як ніколі выявілася жаданне аўтара адысці ад літаратурнасці і вырашыць тэму апасродкавана, "насуперак". У яго карцінах няма ніводнай батальнай сцэны, "ніводнага стрэлу", як казаў ён сам. Аднак па сіле эмацыйнага ўздзеяння, па глыбіні сэнсавай нагрузкі і арыгінальнасці кампазіцыйнага вырашэння "ваенных" твораў Маю Данцыгу, мабыць, няма роўных у беларускім мастацтве.

Сусветнае прызнанне ён атрымаў пры жыцці. У 2015 г. яго маштабнай (амаль 4×7 *м*) алегарычнай карцінай **"І памятае свет уратаваны"** адкрывалася выстаўка "Спадчына Другой сусветнай вайны ў рускім мастацтве" ў лонданскай галерэі Чарльза Саатчы – трапіць сюды марацьусе мастакі свету. Гэтае палатно М. Данцыга і яго "Партызанскую баладу", якая таксама экспанавалася ў Лондане, набыў расійскі бізнесмен, калекцыянер, заснавальнік фонду Art Russe Андрэй Філатаў. У тым жа 2015 г. фонд Art Russe правёў унікальную выставу з удзелам прац Мая Данцыга ў Абу-Дабі ў прэстыжным Emirates Palace, дзе раней выстаўляліся такія мастакі, як Пабла Пікаса. Экспазіцыя знаёміла з мастацкай спадчынай савецкай эпохі.

На стварэнне карціны "І памятае свет уратаваны" ў Мая Данцыга пайшло амаль 10 гадоў. Працаваць над ёй ён пачаў яшчэ ў 1985 г. Майстар успамінаў: «Пісаў я яе з перапынкамі, пакідаў, вяртаўся. А аднойчы ў мяне ў гасцях, у майстэрні на Някрасава, апынуўся Пётр Міронавіч Машэраў, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі, з якім мы былі павярхоўна знаёмыя, і ён убачыў гэтую карціну, тады яшчэ толькі прамаляваную вугалем на палатне, і цвёрда сказаў: "Абавязкова напішы гэтую працу"». І Данцыг напісаў яе. Свайго сапраўднага прызнання карціна чакала некалькі дзесяцігоддзяў…

На палатне перададзены момант "вызвалення" "Сікстынскай мадонны" Рафаэля. Падчас Другой сусветнай вайны Дрэздэн бамбіла амерыканская авіяцыя. Будынак галерэі быў разбураны, аднак карціны загадзя схавалі ў спецыяльна абсталяваным сховішчы. Сярод іх – "Сікстынская мадонна", напісаная мастаком Адраджэння Рафаэлем Санці ў 1515–1519 гг. на замову папы Юлія ІІ для алтара царквы Святога Сікста ў горадзе П'ячэнцы. Тунэль-сховішча знайшлі салдаты Савецкай арміі. Многія карціны былі ў жахлівым стане. Каштоўную знаходку даставілі ў Маскву. Выратаваннем шэдэўраў Дрэздэнскай галерэі займаліся найлепшыя спецыялісты, рэстаўрацыйнай працай кіраваў выдатны савецкі мастак-жывапісец Павел Корын. У 1955 г. калекцыя была цалкам вернута ў Дрэздэн.

**Ілюстрацыйны матэрыял даступны па qr-кодзе.**

«Сам факт вызвалення карцін савецкімі воінамі здаўся мне вельмі сімвалічным, – успамінаў Май Данцыг. – У вызваленні Мадонны заключаецца сэнс таго, дзеля чаго змагаліся савецкія воіны. Яны вызвалілі Еўропу і далі нам жыццё, таму што Мадонна з немаўлём сімвалізуе жыццё. І ў той жа час, паколькі гэта твор мастацтва, у асобе вызваленай Мадонны савецкія воіны вызвалілі Культуру і Цывілізацыю. У цэнтры маёй карціны размешчана Мадонна з немаўлём. Ззаду – армія, злева – паштальён, які ўзносіць Пальміру – вестку пра перамогу. І ўсё гэта над разбуранымі гарадамі, над руінамі. Ёсць яшчэ на карціне мінашукальнік, які ачышчае горад ад брыдоты. Справа сядзяць палонныя нямецкія салдаты на фоне сваіх "спраў" – слупоў канцлагераў. Ніжэй справа бацька трымае на руках загінулага маладога салдата і тут жа – маці, сёстры і жонкі, якія аплакваюць загінулых. І над усім гэтым, над пераможаным Рэйхстагам – Мадонна, якая спускаецца насустрач людзям, ледзь дакранаючыся босымі нагамі да паверхні воблака…»

**"Партызанская балада"** кампазіцыйна нагадвае "П'ету" Мікеланджэла. На карціне намалявана жанчына з вінтоўкай, якая корміць знясіленага партызана грудзьмі на выпаленым полі бою. Мастак называў гэты твор самым апальным. Дарэчы, амаль кожная яго значная праца выклікала супярэчлівыя пачуцці – ад поўнага захаплення да рэзкага непрымання. Напісаная ў 1969 г., карціна сапраўды была ўспрынята ў штыкі выстаўкамам. Яе адхілілі ад удзелу ў паказе. І толькі ў 1988 г. Май Данцыг упершыню змог экспанаваць "Партызанскую баладу" на персанальнай выстаўцы ў Цэнтральным доме мастака на Крымскім вале ў Маскве. Майстар апавядаў: «Тыя, хто яе крытыкаваў, нават не зразумелі, адкуль была запазычана тэма. А натхніўся я рымскім сюжэтам "Бацькалюбства рымлянкі" ў выкананні Паўла Рубенса, калі хадзіў па Эрмітажы. Старца за нейкія грахі пасадзілі ў вязніцу, і ён быў асуджаны на галодную смерць, але да яго прабралася дачка, выкарміла яго грудзьмі і тым самым выратавала. І вось, убачыўшы гэтую працу, я сказаў: "Ды гэта ж наша тэма: маці-зямля беларуская выгадавала



***Май Данцыг.* Паядынак. Легенда Пікаса.** 1985–2012 гг. Палатно, алей. *Уласнасць сям'і мастака.*

партызан!" Менавіта віртуозная гульня аўтара з рознымі стылямі і адсылка да класічных тэм надае твору арыгінальнасць і правакацыйнасць, мастацкую выразнасць і ўнікальнасць, надзяляючы карціну адчуваннем універсальнай чалавечнасці.

Палатно **"Беларусь – маці партызанская"** (1967) у свой час было выбрана на Усесаюзную выстаўку і выклікала шырокі грамадскі рэзананс. Карціна атрымала станоўчы водгук ад міністра культуры СССР Кацярыны Фурцавай. У той час, як прызнаваўся Май Вольфавіч, ён знаходзіўся пад уплывам французскіх майстроў Гюстава Курбэ і Эжэна Дэлакруа. Яму было цікава, падобна да гэтых вялікіх мастакоў, стварыць шмат'ярусную, складаную па рытме кампазіцыю. І Данцыг бліскуча справіўся з пастаўленай задачай. Знізу, у левай частцы палатна, буйным планам паказаны мірныя жыхары розных узростаў. Яны выпраўляюць на вайну сваіх родных, аднавяскоўцаў; мы бачым іх рух ад цэнтра, злева направа. У верхняй частцы палатна ўглыб кампазіцыі сыходзяць у невядомасць фігуры партызан. Насуперак канонам мастак свядома зрабіў два кампазіцыйныя цэнтры, якія, зрэшты, не спрачаюцца адзін з адным, а ўзмацняюць аўтарскую ідэю. Гэта кулямёт, накрыты яркай лапікавай коўдрай, і жанчына, якая трымае на руках немаўля, загорнутае ў такую ж коўдру. У сілуэтным вырашэнні груп людзей на светлым фоне прасочваецца ўплыў майстроў Ранняга Адраджэння.

**"Партызанскае вяселле"** (1968) – унікальны твор. Май Данцыг вырашыў даволі папулярную ў савецкі час тэму зусім нечакана. За наватарства ён нават меў нараканні з боку некаторых калег. Гэтая карціна, перш за ўсё, – гімн жыццю і каханню. У ваенных умовах, якія, здавалася б, выключаюць усялякую рамантыку, здзяйсняецца вялікая таямніца – стварэнне новай сям'і. Аўтар выкарыстоўвае моцны мастацкі прыём – выбудоўвае кампазіцыю на кантрасце. У гушчары змрочнага лесу, які акружае герояў, лютуе смерць, адбываюцца чалавечыя драмы. Але юнак і дзяўчына выхаплены светлавой плямай і нібы азараюць сваёй маладосцю і трапяткім пачуццём усё навокал, прымушаючы цемру адступіць.

Твор **"Пра Вялікую Айчынную…"** (1968) зноў выкананы Маем Данцыгам "насуперак" – арыгінальна і нетрадыцыйна, ад выбару жанру і да самой ідэі. У гэтым нацюрморце жывапісец паглыбіў сюжэтную лінію, стварыўшы мастацкі вобраз асяроддзя пісьменніка ці журналіста, які піша пра вайну. Усё акружэнне, грунтоўна выпісанае майстрам, набывае асаблівы, самакаштоўны сэнс, які раскрывае ўнутраны свет гаспадара пакоя. Каля акна стаіць стол, на ім – друкавальная машынка, поўная попельніца з недакуранай цыгарэтай, партфель, гадзіннік, запалкі. У беспарадку прасторы пакоя адбіліся сляды бяссоннай ночы, адчуваецца душэўны непакой, хваляванне гаспадара намаляваных прадметаў. На стальніцы, ля самага падваконня, стаіць ваза са знявечанай артылерыйскай гільзы з галінкай рабіны. Размашыста напісаная занавеска адкрывае аскетычны раншні пейзаж за акном: цагляныя дамы, занесеныя снегам дахі. У гэтай карціне, як і ў іншых, прысутнічае фірменны колер Мая Данцыга – чырвоны, які для мастака заўсёды быў увасабленнем жыцця, квінтэсэнцыяй яго энергіі. «Ён здольны "запаліць" любую карціну», – тлумачыў аўтар. Згусткі насычанага бардовага ў спалучэнні з пунсовымі "ўспышкамі" надаюць некаторы драматызм і стрыманую ўрачыстасць таму, што адбываецца. Сюжэт нацюрморта нібы абарваны на паўслове. І чысты аркуш паперы ў карэтцы машынкі прапануе гледачу працягнуць разважанні нябачнага пісьменніка, паглыбіцца ў сэнс падтэксту твора. Май Данцыг да адчувальнасці матэрыяльна ўзнавіў прадметы, ён не проста адухавіў бяздушныя рэчы, а захаваў у іх адчуванне часу і прыхаванага дзеяння. У карціне "Пра Вялікую Айчынную…" мастак здолеў адысці ад традыцыйнага разумення нацюрморта. Твор стаў сапраўднай жамчужынай беларускага жывапісу, ён выражае думкі і пачуцці пакалення, якое перажыло вайну.

У такіх знакавых творах на ваенную тэму, як "Паядынак. Легенда Пікаса" (1985–2012), "Малы Трасцянец. Урочышча Благаўшчына. Тут памяцць людзей узведзены помнік" (2015), як ніколі, выявіўся творчы прынцып Мая Данцыга – пісаць без кардону, эскіза, адразу. Віртуознае валоданне малюнкам, выдатнае веданне законаў

кампазіцыі, багатае ўяўленне дазвалялі працаваць менавіта так. Мастак любіў падкрэсліваць, што задумы для карцін ён выношваў вельмі доўга. Часам ідэя магла спець у яго галаве некалькі гадоў. Але як толькі майстар бачыў унутраным зрокам усю кампазіцыю новага твора, ён неадкладна пачынаў працу і даводзіў яе да канца.

За аснову карціны **"Паядынак. Легенда Пікаса"** ўзята гісторыя, звязаная са знакамітай "Гернікай" Пабла Пікаса. Сюжэт твора іспанскага мастака – трагічныя падзеі 26 красавіка 1937 г., калі падраздзяленне люфтвафэ "Легіён Кондар" за некалькі гадзін разбамбіла іспанскі горад Герніку. У карціне Пікаса паказвае боль і жах, што нясе фашызм. Яна лічыцца адным з наймацнейшых антываенных твораў у сусветным мастацтве. Існуе легенда, што ў 1940 г., калі нямецкія войскі былі ў Парыжы, да Пікаса прыйшлі з гестапа. На стале мастака ляжалі паштоўкі з рэпрадукцыяй "Гернікі". "Гэта вы зрабілі?" – спытаўся афіцэр. "Не, – адказаў Пікаса, – гэта зрабілі вы. Можаце ўзяць сабе на памяць".

Палатно Мая Данцыга перадае момант прыходу немцаў у майстэрню Пікаса. Мастак стаіць у глыбіні пакоя на фоне "Гернікі" тварам да гледача і няпрошаных гасцей. Фігура Пікаса, у чыім абліччы аддалена ўгадваецца партрэтнае падабенства з Данцыгам, напісана моцна, упэўнена, размашыста. Ён выглядае гаспадаром сітуацыі. Двое фашыстаў і нямецкая аўчарка глядзяцца лішнімі і непатрэбнымі ў творчай атмасферы майстэрні. Героі карціны напісаны ў маштабе рэальных чалавечых фігур, што стварае эфект прысутнасці гледача ў прасторы твора. Арыгінальнае кампазіцыйнае вырашэнне, нервова-экспрэсіўнае пісьмо, манументальнасць, строга адточаная пластыка раскрываюць унутраны змест мастацкай задумы "Легенды", у якой жыццесцвярджальны пачатак сапраўднага мастацтва супрацьстаіць фашызму і чалавечай жорсткасці.

Да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне Май Данцыг напісаў незвычайны па сіле эмацыйнага ўздзеяння твор **"Малы Трасцянец. Урочышча Благаўшчына. Тут памяццю людзей узведзены помнік"**. Гэта апошняе маштабнае палатно мастака на ваенную тэму, якая стала для яго меркай грамадзянскасці. Праз два гады Майстра не стане…

Лагер смерці, створаны фашыстамі ў ваколіцах Мінска восенню 1941 г., быў найбуйнейшым на тэрыторыі Беларусі. У 2015 г. там адкрыўся мемарыял. Надпіс на абеліску паведамляе: "Тут, у раёне вёскі Трасцянец, нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі, закатавалі, спалілі 201 500 чалавек мірных грамадзян, партызан, ваеннапалонных Савецкай арміі. 1941–1944 гг.".

Карціна "Малы Трасцянец" выклікае складаныя і неадназначныя пачуцці. Яна быццам выткана з мноства найтанчэйшых асацыяцый людской памяці, якія цягнуцца з далёкага ўжо мінулага праз сучаснасць да будучыні. Мастак паказвае тое месца, дзе загінула вялікая колькасць бязвінных людзей. Высокі прафесіянал сваёй справы, Данцыг дамагаецца эфекту поўнай цішыні, што літаральна зыходзіць ад твора. Перад карцінай практычна на інстынктыўным узроўні нараджаецца жаданне замерці і ўшанаваць хвілінай маўчання тых, хто назаўжды застаўся там. Спалучэнне крывава-пунсовага каларыту ствалоў сосаў з халоднымі фарбамі чэзлай травы надае трагедыйны напал усяму палатну. Людзі маўкліва пазіраюць на гледача з фатаграфій, уклееных мастаком проста на жывапісную паверхню ствалоў.

Аднак па сваёй прыродзе Май Данцыг быў аптымістам. Нягледзячы на трагізм таго, што адбылося, мастак насычае палатно дэталямі, якія гавораць пра надзею на жыццё без вайны ў будучыні. На адным ствале дрэва прымацавана шпакоўня. З правага ніжняга вугла карціны ўглыб кампазіцыі ідзе звілістая пратаптаная дарога. Яна пралягае праз той самы сасновы бор, што вырас на месцы трагедыі. Але ні адно дрэва не ссечана. Гэта сведчыць пра павагу жывых да загінулых і пра ўшанаванне іх памяці…

Сфарміраваўшыся як прафесійны мастак у рамантычную эпоху 1960-х, Май Данцыг шмат у чым працягнуў традыцыі "суровага стылю" і ў наступныя дзесяцігоддзі. Але з гадамі эвалюцыя яго творчасці разгарнулася ў бок паглыблення псіхалагізму і сімвалізму мастацкай задумы, індывідуалізацыі вобразнага ладу карцін, узбагачэння жывапіснай манеры, ускладнення пластычнай мовы. Гэта дазволіла пазбегнуць небяспечнай банальнасці, да якой маглі прывесці растыражаваныя стандартныя прыёмы і паўторнае выкарыстанне ідэй. Пры гэтым майстар застаўся верным сваім ідэалам і ўяўленням пра тое, якім павінна быць сапраўднае мастацтва. Яго творы заўсёды пазнавальныя. Яны экспрэсіўныя, эмацыйныя і жыццесцвярджальныя, у іх прысутнічае абвостранае пачуццё грамадзянскасці іх стваральніка.

Мастак гаварыў: "Я толькі баюся, каб не надышла апатыя. Калі знікаюць жаданні і памкненні змяняюцца абыякавасцю, на жыцці можна ставіць кропку. Творчасцю рухае жыццесцвярджальная сіла". Май Данцыг назаўжды застаўся ў памяці сучаснікаў вялікім працаўніком, які, не ведаючы спакою, тварыў высокае мастацтва. У гэтым нам бачыцца асаблівасць творчага шляху майстра і яго феномен.

*Пераклад з рускай мовы.*